## 1. Уводзіны. Літаратура і жыццё

**Мэты і задачы ўрока:** узнавіць і паглыбіць набытыя вучнямі ў пачатковай школе эмпірычныя веды пра літаратуру як мастацтва слова, пра яе тэматычную і жанравую разнастайнасць, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне; прыгадаць вядомыя народныя выслоўі і выказванні выдатных дзеячаў беларускай культуры пра ролю асветы і кнігі ў жыцці чалавека; пазнаёміць пяцікласнікаў з вучэбным дапаможнікам па беларускай літаратуры (зместам, будовай, афармленнем, прызначэннем); садзейнічаць развіццю звязнага маўлення, удасканаленню навыкаў выразнага чытання; спрыяць выхаванню пачуцця гонару і павагі да літаратурнай спадчыны.

**Тып урока** – вывучэнне новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік «Беларуская літаратура. 5 клас»; партрэты і фотаздымкі славутых беларускіх асветнікаў; прыказкі, прымаўкі і выказванні пра ролю асветы і кнігі ў жыцці чалавека; карта краіны Літаратура.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Эпіграфы да ўрока:**

*Кнігі для мяне, як хлеб надзённы, неабходны.*

(Тарас Шаўчэнка)

*Роднае слова – гэта былі не толькі паэты, гэта было само жыццё, з яго раллёй і хлебам, з яго задушэўнымі песнямі і нявыказаным навакольным харавством.*

(Янка Брыль)

*Сярод хаты –*

*Стол для частунку, для бяседы,*

*А на сцяне – рог паляўнічы*

*І стрэльбіна старога дзеда,*

*І побач – з кнігамі паліца.*

*Я ўзяў адну, без пераплёту,*

*Відаць, шмат па руках хадзіла,*

*Відаць, чыталася з ахвотай...*

*“Мой родны кут, як ты мне мілы…”*

(Максім Танк)

*Бясследна нішто не міне,*

*Гісторыя слова адродзіць.*

*Ты – мост,*

*па якім да мяне*

*Мінуўшчына ў госці прыходзіць.*

*Мільгаюць старонкі твае –*

*І мы размаўляем з вякамі,*

*І продак да нас дастае*

*Радкамі, нібыта рукамі.*

*Учора і сёння –*

*Штодня –*

*У люты мароз і ў адлігу*

*Стварае людская радня*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Жыццё непаўторную кнігу.*

*Мы пішам адменным пяром,*

*Што ўручана родным народам.*

*Пілот у нябёсах –*

*крылом,*

*Араты на полі –*

*нарогам.*

*Мы – словы такога пісьма,*

*Якое ў вяках не сатрэцца.*

*Ты – мост,*

*па якім нездарма*

*Іду я з патомкам сустрэцца.*

(Пятрусь Макаль)

*Слова – радасць, слова – чары,*

*Вобраз вечна юных вёсен,*

*Ёсць ты ўсюды: ў сонцы, ў хмары,*

*Ты глядзіш праз неба просінь.*

*Лашчыш слых мой, слова-ззянне,*
*Атуляеш сэрца ласкай,*

*Ноч і вечар, дзень, світанне*

*Абняло ты, слова-краска.*

(Якуб Колас)

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Паведамленне тэмы, вызначэнне мэт і задач урока**

Сёння мы разам павандруем па такой незвычайнай і цікавай краіне Літаратуры і сустрэнемся з яе жыхарамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Вывучэнне новага матэрыялу. Слова настаўніка**

Літаратура – скарбніца духоўнага багацця кожнага народа, адкрываць і вывучаць якую – сапраўдны гонар і асалода.

Літаратурны твор – плён таленту, фантазіі, вопыту і працы аўтара, ён створаны пісьменнікам, у ім побач з мастацкім вымыслам і фантазіяй прысутнічае жыццёвая праўда. Майстар слова – пісьменнік – спачатку абдумвае, пра што напісаць, як пабудаваць твор, якія вобразы і характары стварыць і як выразней іх абмаляваць, каб зацікавіць чытача і заахвоціць да роздуму.

Мастацкі твор – заўсёды нечаканыя адкрыцці, новыя сустрэчы, моцныя перажыванні. Запрашаючы павандраваць у прасторы і часе, пісьменнік дапамагае нам спасцігаць само жыццё, таямніцы чалавечай душы, прымушае хвалявацца за сваіх герояў, суперажываць ім.

Каб зразумець мастацкі твор, нам патрэбны пэўны чытацкі талент – багатае ўяўленне, уменне ўзнаўляць створаныя пісьменнікам карціны, аналізаваць падзеі.

Кожны мастацкі твор напісаны мовай, нашы творы – беларускай. Слова – гэта найдаражэйшы скарб кожнага народа, які шануе сваю мову, лічыць яе сваім неацэнным духоўным набыткам. Высакародную традыцыю ўслаўлення сваёй мовы – найвялікшага духоўнага скарбу – маюць і беларусы.

Сёння мы пяшчотна называем сваю мову роднай, матчынай. Шчырыя і пранікнёныя словы прысвячаюць сваёй мове беларускія пісьменнікі розных пакаленняў. У вершах і прозе яны выказваюць сваю любоў да роднага слова, замілаванасць і захапленне ім: «Магутнае слова, ты, роднае слова!» *(Янка Купала);* «Жывое ў вяках беларускае слова – народа душа і народа хвала» *(Алесь Бачыла);* «Мова, пявучая родная мова, ты – уладарка нявызнаных скарбаў» *(Аляксей Зарыцкі).*

Роднае слова – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём сь.і. Неабходна шанаваць і старанна вывучаць родную мову. Яна дае нам магчымасць атрымліваць веды, вывучаць сваю гісторыю, пераймаць вопыт іншых людзей, праз кнігі пазнаваць людзей і само жыццё, разумець адно аднаго, дзяліцца сваімі думкамі. Кожны адукаваны чалавек павінен умець проста, зразумела і дакладна перадаваць свае думкі вусна і пісьмова. А гэта магчыма толькі тады, калі мы будзем ведаць, як правільна вымаўляць і пісаць словы, як выразна чытаць і як будаваць сказы, каб афарміць свае думкі правільна. Свабоднае валоданне роднай мовай дае таксама магчымасць спасцігнуць здабыткі нашай багатай нацыянальнай культуры.

Нашы продкі пакінулі нам багатую духоўную спадчыну – вусную народную творчасць, якую яшчэ называюць фальклорам. Беларускія народныя міфы, казкі, легенды, прыкметы і павер'і праз стагоддзі з дапамогай надзвычай выразнай і прыгожай роднай мовы перадаюць нам мудрасць, веды, вопыт нашых прашчураў. Сіла і краса народнага мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

надзвычай яскрава адлюстравана ў народных песнях, загадках, прыказках. Яшчэ з далёкіх часоў беларуская мова нястомна служыць народу. Бліскучыя ўзоры ўжывання слова сведчаць пра багаты жыццёвы вопыт і добры густ нашых продкаў.

**Работа над зместам эпіграфаў**

а) Выразнае чытанне эпіграфаў настаўнікам.

б) Удумлівае прачытанне выказванняў вучнямі самастойна.

в) Гутарка па пытаннях:

1. Вы, безумоўна, заўважылі, з якой пяшчотай пісьменнікі гавораць пра сваю мову і літаратуру пра іх багацце і прыгажосць. Як звяртаюцца мастакі да беларускага слова і кніг? Што яны значаць для аўтараў?

2. Якія вобразы перадаюць захапленне роднай мовай і літаратурай? Які з гэтых вобразаў падаўся вам найбольш выразным?

3. Ці ёсць у вашым успрыманні мовы і літаратуры што-небудзь сугучнае пачуццям аўтараў? Выкажыце свае адносіны.

**Чытанне артыкула вучэбнага дапаможніка «Дарагія сябры» (с. 3–4)[1] настаўнікам**

Гутарка па пытаннях:

1. Як называюць людзей, якія ўмеюць цікава апавядаць і прыгожа спалучаць словы? (Пісьменнікі.)

2. Аўтар артыкула Людміла Цітова сцвярджае, што «Краіна літаратуры – гэта валадарства кніг, у якіх захавана духоўнае багацце ўсяго чалавечага роду, досвед і мудрасць нашых продкаў і сучаснікаў – ад фальклорных калыханак, загадак і казак да найноўшых шэдэўраў мастацкага слова”. Ці згодныя вы з гэтым выказваннем? Чаму?

3. З творамі якіх беларускіх пісьменнікаў вы знаёміліся ў пачатковай школе?

**Работа з картай “Краіна Літаратура”**

1. Якія героі могуць жыць у Замку Фальклору?

2. Што такое Дарога Адкрыццяў, куды яна нас можа прывесці?

---

[1] Тут і далей пададзены старонкі вучэбнага дапаможніка: *Цітова, Л. К.* Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. / Л. К. Цітова. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Што такое Замак Фантазіі, хто ў ім жыве, чым займаецца яго насельніцтва?

4. З чым мы можам пазнаёміцца ў Вобласці Паэзіі і Маёнтку Прозы?

5. Хто насяляе Замак Тэм і Сюжэтаў і Браму Літаратурных герояў? Хто з герояў творах, прачытаных у пачатковых класах, вам найбольш спадабаўся і запомніўся? Чаму?

6. Якая варта жыве ў Браме Крытыкаў?

7. Куды прывяла нас Дарога Адкрыццяў? Што гэта за Каралеўства? Хто яго насяляе?

**Знаёмства з вучэбным дапаможнікам**

Мы з вамі здзейснілі падарожжа па Краіне літаратуры, а цяпер давайце павандруем па вучэбным дапаможніку.

1. З якіх раздзелаў складаецца вучэбны дапаможнік? Давайце зачытаем іх назвы і паспрабуем адказаць, пра што будзе ісці гаворка ў іх.

2. Творы якіх жанраў мы з вамі будзем вывучаць у 5 класе?

3. З творамі якіх пісьменнікаў пазнаёмімся?

4. Што знаходзіцца акрамя твораў у вучэбным дапаможніку? Як вы разумееце, што такое "кароткі слоўнік літаратурных паняццяў"?

5. Паглядзіце на фотаздымкі, якія ёсць на форзацы у вучэбным дапаможніку. Апішыце свае ўражанні ад іх.

6. Як бы вы аформілі вокладку вучэбнага дапаможніка, калі б былі мастаком?

**4. Падагульненне**

Такім чынам, мы сёння павандравалі па цікавай і незвычайнай краіне літаратуры, пазнаёміліся з яе героямі. Давайце паслухаем яшчэ некалькі выказванняў пісьменнікаў пра ролю літаратуры ў жыцці чалавека:

*Для мяне кніга заўсёды была цудам. Яна была для мяне, можна сказаць, – настаўнікам жыцця* (Іван Мележ).

*Заўсёды з любай кніжкай быў,*

*І быццам аж мільёны жыццяў*

*Я за адно сваё пражыў* (Пятрусь Броўка).

**5. Замацаванне вывучанага**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Складанне сінквейнаў «літаратура» і «кніга»

Прыклад сінквейна

Мова

Родная мілагучная

Люблю шаную саграває

Прыгожа звініць сардэчнаю струною

Радзіма

**6. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак**

**7. Рэфлексія**

Працягніце фразу

Сёння я даведаўся…

У мяне атрымалася…

Я буду…

Мне было…

**8. Інфармацыя пра дамашняе заданне і інструктаж па яго выкананні**

Заданне даецца на выбар:

1. Падрыхтаваць праект "Чароўная краіна Літаратура" (намаляваць карту, скласці гімн, прыдумаць геаграфічныя назвы, напісаць кароткую гісторыю краіны).

2. Запісаць у літаратурныя сшыткі асацыятыўны рад да слоў «літаратура» і «кніга». Побач напісаць словы, якія не стасуюцца з паняццямі «літаратура» і «кніга».

3. Скласці алфавіт "Літаратура":

Л –

І –

Т –

А –

Р –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А –

Т –

У –

Р –

А –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ